Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 4 (97), 2016

*УДК 2-9 (476)(XVI – XVII)*

# Узвышэнне грамадскага статусу каталіцкай канфесіі ў беларускіх гарадах у другой палове XVII ст.

А.Ю. Барташэвіч

Разглядаецца праблема ўзвышэння грамадскага статуса каталіцкай канфесіі ў беларускіх гарадах Вялікага Княства Літоўскага ў другой палове XVII ст. і фактараў, якія гэта абумовілі. Аўтар звяртае ўвагу на ідэалагічную «перамогу» каталіцтва пасля ваенных падзеяў 1648–1667 гг., на актыўны ўдзел каталіцкай царквы ў грамадска-палітычным жыцці, адкрыцці ўстаноў адукацыі і г. д. Асаблівая ўвага ў артыкуле надаецца праблемам імклівага распаўсюджвання польскай культуры і мовы на землях Вялікага Княства Літоўскага, атаясамленні каталіцтва і «польскасці» ў грамадскай свядомасці, фарміраванні ўяўленняў аб іх «элітарнам» статусе.
**Ключавыя словы:** каталіцтва, мяшчанства, шляхта, грамадскі статус, канфесія, традыцыя, сацыяльныя стэрэатыпы

The problem of the enhancement of the public profile of the Catholic confession in Belarusian towns of Grand Duchy of Lithuania in the second part of 17th century and the problem of factors that had induced it are considered. The ideological «victory» of the Catholicism after the war events of 1648–1667, the participation of the Catholic Church in a social-political life and the foundation of educational establishments are emphasized. Great attention is focused on the issue of rapid proliferation of the Polish language and culture through the territory of Grand Duchy of Lithuania, the identification of notions of Catholicism and «polishism» in public awareness and forming ideas of their «elitist» status.
**Keywords:** Catholicism, merchants, nobility, public profile, confession, tradition, social stereotypes.

**Уводзіны**. Вывучэнне праблемаў канфесійнага развіцця грамадства Вялікага Княства Літоўскага ў XVII ст. мае даўнюю гістарыяграфічную традыцыю. У XIX ст. імі займаліся расійскія навукоўцы-«заходнерусісты» – І. Чыстовіч, Г. Кіпрыяновіч, М. Каяловіч, якія разглядалі рэлігійную гісторыю Беларусі праз прызму барацьбы «заходняй» і «візантыйскай» цывілізацыяў, негатыўна ацэньваючы каталіцкую і ўніяцкую царкву [1]. Працы савецкіх гісторыкаў-медыявістаў (Л. Абэцэдарскі, Я. Мараш, А. Ігнаценкі і іншыя) разглядалі рэлігію як сродак эксплуатацыі працоўных мас, аднак асобна выдзялялі «негатыўны» патэнцыял каталіцкай і ўніяцкай канфесій [2]. Гісторыкі «нацыянальнай школы» (М.В. Доўнар-Запольскі, І. Касяк, А. Станкевіч) былі схільны бачыць ва ўніяцкай царкве фактар захавання нацыянальных традыцый і мовы [3]. На сучасным этапе рэлігійнай гісторыяй Беларусі XVI–XVIII стст. займаюцца С. Марозава, Л. Іванова, І. Марзалюк [4]. Праблемы рэлігійнай гісторыі Беларусі адлюстраваны ў працах расійскага гісторыка Л. Забароўскага, польскіх даследчыкаў – Б. Тапольска, Ю. Бардаха, М. Лідке [5].

У папярэдніх даследаваннях і працах 1660–1690-я гг. разглядаліся як час культурнага і эканамічнага калапсу земляў Вялікага Княства Літоўскага, перыяд хуткай паланізацыі і акаталічвання. Распаўсюджванне каталіцкай канфесіі і рост папулярнасці ўніяцтва ў гэты перяд гісторыкі звязвалі, пераважна, з мэтанакіраванай палітыкай эліт Рэчы Паспалітай, актывізацыяй асветніцкай дзейнасці каталіцкіх ордэнаў, аслабленнем праваслаўнай царквы ў выніку войнаў 1648–1667 гг. і г. д. На думку аўтара, недастаткова ўвагі надавалася такому фактару – як узрослы грамадскі статус каталіцтва, яго сацыяльная атракцыйнасць (прыцягальнасць) у тагачасным грамадстве Вялікага Княства Літоўскага, і абставінаў, якія гэта абумовілі.

**Каталіцтва і фарміраванне грамадскіх ідэалаў.** У другой палове XVII ст. канфесійнае пытанне набыло асаблівую вастрыню і актуальнасць у грамадстве Рэчы Паспалітай. Беларускія землі, дзе жыло шматканфесійнае насельніцтва апынулася пад уздзеяннем новых культурных і рэлігійных тэндэнцый, у тым ліку новай мадэлі канфесійных узаемаадносінаў, прапанаванай уладай. Гэта было звязана з тым, што ваенныя падзеі 1648–1667 гг. падарвалі матэрыяльную базу праваслаўя, аслабілі яго ўплыў на грамадства, на гэтым фоне адбываецца рост папулярнасці ўніяцтва якое «ўвабрала» частку праваслаўнай паствы. Пры падтрымцы

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

дзяржаўнай улады адбылася новая хваля контррэфармацыі, якая выціснула пратэстантызм і праваслаўе на перэферыю палітычнага і культурнага жыцця [6, с. 68].

У гэты перыяд каталіцкая канфесія («рымская вера») і яе носьбіты набылі новыя правы і прывілеі, якія выдзялялі іх з масы іншых хрысціянскіх вернікаў і надавалі больш высокі сацыяльны статус. Каталіцкая вера была пэўным чынам сакралізавана і з’яўлялася, пасутнасці, «культурным маркерам» (разам з польскай мовай), што сведчыла аб прыналежнасці да шляхты – эліты тагачаснага грамадства Рэчы Паспалітай. Першапачаткова каталіцтва распаўсюджвалася сярод уплывовых і заможных саноўнікаў, вярхушкі найбольш знакамітых шляхецкіх родаў – магнатэрыі. У сваю чаргу, сярэдняя і дробная шляхта ішла за магнатэрыяй у справе канфесійных пытанняў, арыентавалася на яе [5, с. 198]. Веравызнанне магло дапамагчы ў атрыманні пратэкцыі з боку ўплывовага магната, забяспечыць шляхціч лепшыя ўмовы для ўласнай кар’еры.

Эпоха барока і ідэалогія сарматызму знайшла адлюстраванне ў разбудове пышных каталіцкіх архітэктурных комплексаў у беларускіх гарадах, мецэнацтве магнатаў і шляхты, ідэйна – ў дамінацыі каталіцкай канфесіі ў грамадскім і культурным жыцці Рэчы Паспалітай [7, с. 97].

Пасля ваенных падзей 1648–1667 гг. каталіцкая вера і прыналежнасць да яе сталі прыкметай палітычнай лаяльнасці каралю, патрыятызму, адданасці дзяржаве. Праваслаўная Маскоўская дзяржава, якую падтрымала праваслаўнае ўкраінскае казацтва і частка беларускіх праваслаўных мяшчан і шляхты вяла вайну з шматканфесійнай Рэччу Паспалітай. Пратэстанцкая Швецыя ўступіла ў вайну супраць Рэчы Паспалітай у 1655 г., знайшла сваіх прыхільнікаў сярод пратэстантаў Вялікага Княства Літоўскага (у тым ліку, сярод прадстаўнікоў знакамітых магнацкіх і шляхецкіх родаў – Радзівілы, Мірскія, Камароўскія, Гружэўскія, Дунін-Раецкія і інш.), якія спрабавалі аслабіць палітычную залежнасць Княства ад Польшчы, пашырыць рэлігійную талерантнасць [8, с. 133]. Ваенныя поспехі Рэчы Паспалітай (як падчас «патопу» і казацка-сялянскай вайны, так і падчас паходаў супраць крымскіх татараў і Атаманскай порты) спрыялі кансалідацыі ваенна-служылага саслоўя – рознаэтнічнай шляхты дзяржавы вакол каталіцкай веры. Менавіта ў гэты перыяд сярод эліты Рэчы Паспалітай пашыраецца меркаванне, што першапачатковыя ваенныя няўдачы, якія паставілі дзяржаву на мяжу згубы, былі «Божым пакараннем» за талерантнасць і «спрыянне» праваслаўным і дысідэнтам у Рэчы Паспалітай – нібыта ворагаў «сапраўднай» веры – каталіцтва [8, с. 274]. Характэрна, што падчас вайны 1648–1667 гг. шляхцічы (асабліва каталіцкага веравызнання), што прысягнулі на вернасць маскоўскаму цару і прынялі праваслаўе – разглядалася каралём і астатняй каталіцкай шляхтай не толькі як адступнікі, што выступілі супраць караля і дзяржавы, але і як «здраднікі веры святой каталіцкай». У скарзе на ашмянскага шляхціча Андрэя Рагінскага адзначалася, што апошні нягледзячы, на шляхецкі стан, «прадаўся Маскве», калі яна захапіла Вільню. У скарзе ён быў ахарактарызаваны як «адшчапенец касцёла святога і рымскай кафедры», бо, прысягнуўшы цару, ён перахрысціўся ў праваслаўе [9, с. 308].

У кантэксце вышэйсказанага цікавымі з’яўляюцца абставіны інтрадукцыі (ўнясення) іконы Маці Божай у гродзенскі езуіцкі касцёл 3 жніўня 1664 г. Гродна на працягу 1655–1661 гг. быў двойчы акупаваны царскім войскам, разбураны храмы розных канфесій [10, с. 98]. Галоўнай мэтай мерапрыемства, як указваюць крыніцы, было «ўмацаванне сэрцаў» жыхароў горада і ваколіц – вызваць пачуццё еднасці, надзею на аднаўленне мірнага жыцця, аптымізма [10, с. 97]. Згодна з сведчаннямі відавочцы і удзельніка тых падзей, у працэсіі інтрадукцыі прынялі ўдзел каля 5 тыс. чалавек – цэхавыя рамеснікі з харугвамі, гарадскі патрыцыят («радныя»), мясцовая і запрошаная шляхта, манахі каталіцкіх ордэнаў, студэнты езуіцкай школы, просты люд [10, с. 104]. Сцэнар працэсіі быў распрацаваны па старажытнарымскі ўзоры, і можа быць інтэрпрэтаваны як трыумфальнае шэсце на чале з іконай, якая абараніла жыхароў горада і даравала перамогу над іншаверцамі і чужынцамі [10, с. 106].

Пасля «патопу» ўладная эліта запрашала і матэрыяльна стымулявала новыя каталіцкія асяродкі, пашырала старыя фундацыі каталіцкіх ордэнаў на землях Вялікага Княства Літоўскага [11, с. 54]. На сейме 1683 г. было пацверджана заснаванне езуіцкага калегіума ў Мінску – «зважаючы на неабходнасць памнажэння хвалы Божай сярод розных дысідэнтаў»

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

[12, с. 339]. Сейм 1678 г. ўхваліў заснаванне езуіцкай місіі пры фарным касцёле ў Магілёве – «для абарачэння душ, схізмай апантаных» [12, с. 310].

Дакументы эпохі адлюстроўваюць адносіны эліты да асноўных хрысціянскіх канфесій: у каралеўскіх дэкрэтах, соймавых пастановах каталіцтва ўсё часцей называецца «святой каталіцкай верай»; праваслаўе і праваслаўныя фігуруюць як «дызунія», «дызуніты», часта ўжываюцца абазначэнні «схізма, схізматыкі» [12, с. 280]. Пратэстанты ў афіцыйных актах выступаюць як «дысідэнты», «евангелісты», прадстаўнікі радыкальных плыняў пратэстантызму (арыяне і іншыя) –«ерэтыкі» [13, с. 83].

Паказальнай з’яўляецца пратэстацыя базыльянскага пракуратара Алешэўскага (ад імя ўніяцкага мітрапаліта Л. Залескага) супраць віленскага магістрата. У дакуменце мітрапаліт называў Рэч Паспалітую «каталіцкай дзяржавай», дзе ўсё робіцца для «рымскай» рэлігіі і дзе яна з’яўляецца галоўнай. На думку пракуратара, астатнія цэрквы і «секты» павінны «памяншацца ў правах». Трэба заўважыць, пад «людзьмі каталіцкімі» Алешэўскі разумеў як асобаў каталіцкага веравызнання, так і ўніятаў [14, с. 143].

**Удзел каталіцкай царквы ў грамадскім жыцці Рэчы Паспалітай.** Каталіцкія ордэны выступалі арганізатарамі і прымалі ўдзел у наступных свецкіх святах: каранацыя караля (яе гадавіны), пачаткі соймаў, трыбуналаў, соймікаў, уступленне ураднікаў на пасады, імяніны і дзень народзінаў караля, попісы войскаў, пачатак навучальнага года і інш. [15, с. 102]. У Гродна, у касцёле езуітаў і ў касцёле Успення Маці Божай (Фара Вітаўта) праводзіліся ўрачыстыя набажэнствы з нагоды засядання ў горадзе соймаў Рэчы Паспалітай, сесій Галоўнага трыбунала Вялікага Княства Літоўскага.

Манахі каталіцкіх ордэнаў удзельнічалі ў прывітальных урачыстасцях пры ўездзе ў горад важных асобаў (караля, епіскапаў, ураднікаў, военачальнікаў). У 1688 г. віленскія езуіты арганізвалі ўрачыстую сустрэчу каралю Яну Сабескаму, які прыбыў у Вільню разам са сваім сынам і світай. Кароль уехаў у горад праз асобую браму, спецыяльна для гэтай мэты пабудаваную, наведаў касцёлы і кляштары, навіцыят. Езуіты віталі караля панегерыкам у касцёле, навучэнцы калегіума прыўрочылі да гэтай сустрэчы публічны дыспут [16, с. 87]. Езуіты ў Мінску прынялі актыўны ўдзел у трыумфальным шэсці з нагоды наведвання горада канцлерам Вялікага Княства Літоўскага Марцыянам Агінскім у 1689 г. [17, с. 60]. У лістападзе 1697 г. у Віцебску праходзілі ўрачыстыя мерапрыемствы з нагоды каранацыі караля Аўгуста III. У трыумфальным шэсці разам з іншымі гараджанамі актыўны ўдзел прымала каталіцкае і ўніяцкае духавенства. Святочнае шэсце завяршылася урачыстым багаслужэннем у касцёле езуітаў і ўніяцкай царкве Уваскрасення Хрыстова [17, с. 61].

Каталіцкія манахі (асабліва місіянерскіх ордэнаў) падтрымлівалі кантакты з ураднікамі, дэлегавалі сваіх прадстаўнікоў на сойм у якасці назіральнікаў, былі арганізатарамі і ініцыятарамі малітваў і набажэнстваў за поспех палітычных спраў, нарэшце, актыўна выкарыстоўвалі пропаведзь для фарміравання настрояў сваёй паствы [15, с. 71–72]. Кляштарныя памяшканні служылі месцам пасяджэння розных органаў свецкай улады: сесій павятовых соймікаў, каптуровых судоў, скарбовых камісій [15, с. 87]. Верагодна, што ў другой палове XVII ст. гарадзенская шляхта праводзіла свае форумы ў каталіцкіх кляштарах, пра адзін з якіх – бернардзінскі – можна казаць упэўнена [18, с. 226]. На думку беларускай даследчыцы Г. Паўлоўскай, гродзенскі езуіцкі касцёл адразу ўзводзіўся з улікам яго прадстаўнічай і грамадскай функцыі [18, с. 230].

Каталіцкая царква імкнулася да свайго роду «духоўнай манаполіі», кіруючай ролі ў асвячэнні важнейшых дзяржаўных падзей. Каталіцкія набажэнствы, святочныя рэлігійныя цырымоніі з барочнай пышнасцю і відовішчнасцю, якія былі прымеркаваныя як да рэлігійных святаў, так і да важных грамадскіх і дзяржаўных падзей – прыцягвалі ўвагу гараджан, скіроўвалі іх сімпатыі і цікавасць на карысць «рымскай веры». Гэтаму спрыяў таксама шырокі ўдзел у каталіцкіх святочных цырымоніях гараджанаў усіх канфесій, у тым ліку праваслаўных. Напрыклад, цэхавыя статуты абавязвалі ўсіх рамеснікаў цэху рыхтавацца і прымаць удзел ва ўрачыстасцях у гонар «рымскіх святаў» – Божага цела і інш. [13, с. 77].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

**Спецыфіка мяшчанскага асяроддзя. Каталіцтва – як частка «высокай» культурна-моўнай традыцыі.** Некаторая частка шляхты заўсёды жыла ў горадзе, адпаведна – уплывала на звычкі і густы мяшчанства. Пасля «патопу» спустошаныя і малалюдныя беларускія гарады актыўна запаўняла збяднелая (і часткова сярэдняя) шляхта, актыўней прыбывалі шляхецкія іміграны з Заходняй Еўропы. Дакументы 70–90-х гг. XVII ст. канстатуюць значнае павелічэнне прыватных шляхецкіх юрыдык у гарадах [19, с. 225]. Пасля ваенных падзей 1654–1667 гг. гродзенскі магістрат для папаўнення гарадскога скарба і аднаўлення гаспадаркі быў вымушаны займацца продажам гарадскіх пляцаў у лібертацыю (прыватная ўласнасць, вызваленая ад гарадскіх падаткаў) магнатам і сярэдняй шляхце. Цікавасць магнатаў і шляхты да набыцця гродзенскіх пляцаў была выклікана таксама Канстытуцыяй 1673 г., па якой Гродна станавіўся соймавым горадам [19, с. 225]. Заможная і ўплывовая частка гараджан (з ліку цэхавых майстроў,ураднікаў, купцоў) па прыкладу шляхты пераходзіць у каталіцтва.

Аб значнай распаўсюджанасці каталіцкай канфесіі сярод беларускіх мяшчан сведчыць падзел рамесніцкіх цэхаў ва ўсіх беларускіх гарадах на каталіцкую («рымскую») і праваслаўную («рускую») часткі [13, с. 79]. Зразумела, што католікамі ў такім цэху былі і звычайныя рамеснікі, і заможныя майстры. У XVII ст. стала назірацца тэндэнцыя паступовага згортвання правоў рамеснікаў-некатолікаў – пад пагрозай штрафу іх абавязвалі наведваць каталіцкія багаслужэнні. Згодна з статутам цэха віленскіх шкляншчыкаў, браты цэха павінны былі наведваць бернардынскі касцёл, дзе цэх меў алтар. Статут абавязваў братоў цэха наведваць касцёльную імшу, удзельнічаць у цырымоніях з нагоды каталіцкага свята Божага Цела. Цэхавыя рамеснікі «іншай рэлігіі» пазбаўляліся ад «касцёльных абавязкаў» на год пры ўмове выплаты грашовай сумы [13, с. 36]. Цэхі, якія дзяліліся на "рускую" і «рымскую» часткі, звычайна мелі свой алтар у каталіцкім касцёле, ці, радзей – ва ўніяцкай царкве [13, с. 73].

Другая палова XVII ст. – час узмацнення ўплыву польскай культуры на Вялікае Княства Літоўскае. Гэта было звязана як з ваеннымі спусташэннямі, гібеллю і вывадам у палон людзей – носьбітаў праваслаўнай і ўніяцкай традыцый, падрывам матэрыяльнай асновы ўсходняй царквы ў ВКЛ, так і з новай хваляй контррэфармацыі – разбудовай вялікай колькасці новых каталіцкіх місій, пашырэннем іх асветніцкай дзейнасці. Менавіта ў гэты перыяд у Рэчы Паспалітай завяршаецца працэс «нацыяналізацыі» («паланізацыі») каталіцызму, ствараецца мадэль культуры, у якой адбываецца атаясамленне «польскай» веры і польскай нацыянальнасці [20, с. 81]. Польская культурная і моўная традыцыя пачынае выступаць як «узорная», ці «высокая», ў параўнанні з мясцовымі звычаямі і мовай. Гэта знайшло адлюстраванне, напрыклад, у пастаноўках гарадскіх школьных тэатраў, дзе творы «высокіх» жанраў (драма, трагедыя) ставіліся на «шляхетных» мовах – польскай ці лацінскай, а больш простыя творы забаўляльнага жанру (камедыя, інтэрмедыя) часта гучалі на «простай» мове – па-беларуску [17, с. 70]. У інтэрмедыі сярэдзіны XVII ст. «Іван і царкоўны сторож» атаясамляецца каталіцызм і польскасць, якому супрацьстаяць уніяцтва і праваслаўная вера. Пры гэтым праваслаўе выступае як «мужыцкая» вера, а каталіцтва і ўніяцтва вызнаюць паны [20, с. 84]. Падобная культурная сітуацыя надавала асобы «элітны» статус каталіцтву, гэта і зразумела, паколькі напісаннем, арганізацыяй і пастаноўкай тэатральных твораў займаліся прадстаўнікі інтэлектуальнай эліты – выкладчыкі і студэнты каталіцкіх навучальных устаноў [17, с. 65].

Можна ўпэўнена меркаваць, што на той час існавала даволі выразная залежнасць паміж сацыяльным статусам прадстаўнікоў розных саслоўяў і характарам выкарыстанай мовы. Магнаты, шляхта і патрыцыят хутчэй засвойвалі польскую мову – больш высокі стасус якой мог забяспечыць іх рост у грамадскай іерархіі. У меншай ступені гэты ўплыў спазнала дробная, засцянковая шляхта, гарадскія нізы, сялянства [21, с. 15]. Польская мова, дзякуючы набытаму больш высокаму сацыяльнаму статусу яе носьбітаў, становіцца адным са шляхоў распаўсюджвання (рэтрансляцыі) рыма-каталіцтва ў гарадскім асяроддзі. Соймавая пастанова 1696 г., якая пакінула адзінай мовай справаводства польскую – з аднаго боку, замацавала фактычнае становішча спраў: на той час канцэлярыі Вялікага Княства Літоўскага амаль не выкарыстоўвалі беларускую мову ў сваёй дзейнасці, з другога боку – польская моўна-культурная дамінацыя атрымала юрыдычны статус на «ўсходніх абшарах» Рэчы Паспалітай.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

**Юрыдычнае афармленне высокага грамадскага статусу каталіцкай веры і католікаў. Сацыяльная і асветніцкая актыўнасць каталіцкай царквы.** У другой палове XVII ст. канфесійная прыналежнасць месціча стала мацней уплываць на яго грамадскую кар'еру і сацыяльны статус. Пасля «патопу» нарастала тэндэнцыя абмежавання правоў некатолікаў – недапушчэння іх на выбарныя пасады ў магістрат, да старшынства ў цэхах [13, с. 301]. Ужо ў пастанове Гадзяцкай камісіі 1658 г. (пра ўмовы аб'яднання часткі ўкраінскіх земляў – Вялікага Княства Рускага гетмана І. Выгоўскага з Рэччу Паспалітай) адзначалася, што «ў каралеўскіх гарадах і Вялікім Княстве Літоўскім, дзе праваслаўная царква ёсць, нароўні мяшчане як Рымцы, так і рэлігіі грэцкай агульныя вольнасці, свабоды ўжываць могуць, і не аднаму праваслаўнаму перашкод у магістрат быць не можа». Гэта палажэнне сведчыла аб ужо існуючай практыцы абмежавання правоў праваслаўных гараджан [22, с. 297]. Некатолік фактычна пазбаўляўся магчымасці атрымаць шляхецтва і, адпаведна, дзяржаўную пасаду, уладу, буйныя матэрыяльныя сродкі. У 1667 г. памёр апошні праваслаўны сенатар-русін Аляксандр Агінскі. У 1669 г. яго сын, апошні праваслаўны магнат Марцыян Агінскі, перайшоў у каталіцтва, каб атрымаць сенатарскую годнасць [8, с. 276]. «Грэцкую веру» вызнавала значная частка сярэдняй і дробнай «рускай» шляхты, але яны не ўяўлялі значнай палітычнай сілы ў алігархічнай Рэчы Паспалітай [23, с. 217].

Кароль Ян Казімір спецыяльным загадам 1667 г. паставіў выбары ў магілёўскі магістрат у залежнасць ад патрыцыяў-католікаў, і каб магілёўскі каталіцкі «плябан» быў «першым ураднікам» у магілёўскім магістраце. За невыкананне гэтага загаду быў нават вызначаны штраф у 5 тыс. злотых, палова з якога мусіла ісці на карысць магілёўскага фарнага касцёла [24, с. 282].

Сойм 1669 г. прыняў новы закон «Rex catholicus esto», згодна з якім, каралём Рэчы Паспалітай мог стаць толькі католік: «пан рэлігіі іншай не будзе абраны, толькі той, які быў і павінен заставацца рэлігіі рымскай, таксама рымскай каталіцкай рэлігіі павінна быць і каралева» [12, с. 11]. Фактычна, закон юрыдычна замацаваў і аформіў вышэйшы грамадскі статус (аўтарытэт) каталіцкай рэлігіі ў дзяржаве.

Далучанасць да «рымскай веры» азначала далучанасць да заходнееўрапейскай культуры і адукаванасці – гэта адпавядала патрабаванням і інтарэсам шляхты і заможнага мяшчанства. Каталіцкай канфесіі належыла большасць устаноў адукацыі і культуры (калегіумы, бурсы, друкарні, бібліятэкі), якія размяшчаліся пры кляштарах каталіцкіх ордэнах (піяраў, езуітаў, баніфратаў і інш). У 1670–1680-я гг. віленскі езуіцкі калегіум паўнавартасна аднавіў сваю дзейнасць: пачала працаваць школа рыторыкі, бібліятэка, быў сабраны калектыў прафесароў-выкладчыкаў. У 1664 г. езуіцкая школа ў Гродна пачынае сваю дзейнасць у якасці калегіума. У 1670-я гг. полацкія езуіты аднавілі дзейнасць калегіума – працавала школа гуманітарных дысцыплін для свецкіх вучняў, школа рыторыкі для клерыкаў, пашырыліся зборы бібліятэкі. У Наваградку езуіты адчынілі школу «humaniora» (па гуманітарных ведах) ужо ў 1665 г., а ў 1679 г. пачала працаваць школа рыторыкі. Да 1675 г. быў адрэстаўраваны касцёл і калегіум езуітаў у Пінску. У 1682 г. пачаў працу віцебскі езуіцкі калегіум, да канца стагоддзя віцебская місія атрымала будынкі бурсы і аптэкі. Езуіты пашырылі сваю дзейнасць у Нясвіжы: быў пабудаваны новы калегіум пры касцёле св. Міхаіла (1689 г.) [11, с. 56]. У другой палове XVII ст. езуіцкія школьныя тэатры дзейнічалі ў 14 беларускіх гарадах, сярод іх Полацк, Нясвіж, Орша, Пінск, Брэст, Бабруйск, Навагрудак, Мсціслаўль, Гродна, Драгічын, Мінск, Мышы, Магілёў, Слуцк [17, с. 68]. Польская даследчыца М. Лідке слушна заўважае, што езуіцкія школы адыгралі важную ролю ў канверсіі на карысць каталіцкай канфесіі [5, с. 198]. Істотную ролю ў гэтым працэсе адыгралі і заходнееўрапейскія каталіцкія ўніверсітэты, дзе вучыліся як маладыя шляхцічы, так і дзеці заможных мяшчан.

Каталіцкія ордэны займаліся дабрачыннай дзейнасцю, якая была звязана са штодзённымі гарадскімі патрэбамі. Узрослыя фінансавыя магчымасці каталіцкай царквы дазвалялі ёй пры кляштарах адчыняць шпіталі, апекавацца «лёзнымі» людзьмі і нямоглымі, вязнямі ў турмах, клапаціцца аб хворых падчас эпідэмій і інш., што таксама ўмацоўвала аўтарытэт заходняга хрысціянства на беларускіх землях [25, с. 506].

Прыхільнасць шляхты, а таксама найбольш заможнага і адукаванага мяшчанства беларускіх гарадоў да каталіцтва (і ў пэўнай ступені ўніяцтва), у той час як сацыяльныя нізы горада і дробная шляхта, а таксама сялянства вызнавалі праваслаўе, зноў жа спрыяла справе

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

«сацыяльнага прэстыжу» каталіцкай веры. У тагачасным грамадстве ўмацоўвалася меркаванне, што носьбітамі каталіцкай веры з'яўляюцца заможныя, уплывовыя, адукаваныя людзі, а носьбітамі «схізмы» – просты люд. Такім чынам, канфесійны фактар стаў напаўняцца сацыяльным зместам, сацыяльнымі стэрэатыпамі.

**Заключэнне.** Узвышэнне грамадскага статусу і сацыяльнай атракцыйнасці каталіцтва стала вынікам наступных абставінаў і фактараў:

– Дыскрэдытацыя праваслаўных і пратэстантаў у ходзе ваенных падзей 1648–1667 гг. – удзел у падтрымцы варожых Рэчы Паспалітай бакоў: Маскоўскага царства, Швецыі, украінскага казацтва. Каталіцкая царква, каталіцкія шляхта і мяшчанства ў сваёй большасці падтрымалі каралеўскую ўладу і адзінства дзяржавы.

– Ангажаванасць каталіцкай царквы ў грамадска-палітычнае жыццё: арганізацыя урачыстых багаслужэнняў у гонар палітычных падзей, святочныя сустрэчы дзяржаўных дзеячоў, прадстаўленне кляштарных памяшканняў для пасяджэння шляхецкіх соймікаў і інш.

– Завяршэнне працэсу «паланізацыі» каталіцтва, узвышэнне статусу польскай культуры і мовы на землях Вялікага Княства Літоўскага. Фарміраванне ўяўленняў пра тоеснасць каталіцтва і «польскасці», а таксама каталіцтва і шляхецтва.

– Фарміраванне ўяўленняў пра шляхецкую культуру – як узорную для астатняга грамадства. Распаўсюджванне шляхецкіх каштоўнасцей і звычак у мяшчанскім асяроддзі.

– Абмежаванне рэлігійных, маёмасных і грамадскіх правоў некатолікаў.

– Актыўны ўдзел каталіцкай царквы ў сацыяльнай і адукацыйнай сферы. Фарміраванне станоўчага іміджу каталіцкай царквы – як папулярызатара ведаў, асветы, грамадскіх ідэалаў.

## Літаратура


1. Киприянович, Г.Я. Исторический очерк православия, католичества и унии в Белоруссии и Литве / Г.Я. Киприянович. – Минск : Изд-во Белорусского Экзархата, 2006. – 352 с.
2. Мараш, Я.Н. Ватикан и католическая церковь в Белоруссии (1569–1795 гг.) / Я.Н. Мараш. – Минск : Выш. Школа, 1971. – 270 с.
3. Станкевіч, А. Хрысціянства і беларускі народ. Спроба сынтэзы / А. Станкевіч. – Вільня, 1940. – 131 с.
4. Марозава, С.В. Уніяцая царква ў этнакультурным развіцці Беларусі (1596–1839 гг.) / С.В. Марозава. – Гродна : ГрДУ, 2001. – 353 с.
5. Liedke, M. Od prawosławia do katolicyzmu. Ruscy możny i szlachta Wielkiego Księstwa Litewskiego wobec wyznan reformacyjnych / M. Liedke. – Białystok, 2004. – 317 s.
6. Барташэвіч, А.Ю. Канфесійная палітыка дзяржаўнай улады Рэчы Паспалітай на беларускіх землях у апошней трэці XVII ст. (1667–1701 гг.) / А.Ю. Барташэвіч // Веснік Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Серыя А. Гуманітарныя навукі. – 2012. – № 9. – С. 67–73.
7. Клімуць, Л. Мецэнацтва і шляхецкі патранаж у Рэчы Паспалітай XVI–XVIII стст. і іх сацыяльнае значэнне / Л. Клімуць // Роднае слова. – 2003. – № 11. – С. 97–98.
8. Катлярчук, А. У ценю Польшчы і Расеі. Вялікае Княства Літоўскае і Швэцыя ў часе эўрапейскага крызісу сярэдзіны XVII ст. / А. Катлярчук. – Мінск : ARCHE, 2008, 2009. – 306 с.
9. Акты Виленской археографической комиссии. – Вильно : Тип. А.Г. Сыркина, 1893. – Том 20: Акты касающиеся города Вильны. – 673 с.
10. Левшук, В.Е. Процессия студентов гродненского иезуитского коллегиума в 1664 г. как ритуал обозначения центра сакрального пространства города. / В.Е. Левшук // Гістарычная ўрбаністыка: асновы метадалогіі і крыніцазнаўчая база: зб. навук. арт. / ГрДУ імя Я.Купалы ; рэдкал. : І.В. Соркіна (гал. рэд) [і інш.]. – Гродна : ГрДУ, 2011. – С. 95–110.
11. Барташэвіч, А.Ю. Гісторыя каталіцкіх ордэнаў на беларускіх землях у другой палове XVII ст.: місіянерства і культурна-асветніцкая дзейнасць / А.Ю. Барташэвіч // Веснік Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Серыя А. Гуманітарныя навукі. – 2013. – № 9. – С. 54–58.
12. Volumina Legum. T. V. Prava, konstytucye i przivileie krolewstwa Polskiego, Wielkiego Xiestwa Litewskiego y wszystkich prowincyi nalezacych na walnych sejmiech koronnyh. Ab anne 1669 ad annum 1697. – Petersburg : nakladem i drukiem Jozafata Ohryzki, 1860. – 480 s.
13. Акты Виленской археографической комиссии. – Вильно : Тип. А.Г. Сыркина, 1879. – Том 10 : Акты Виленского магистрата и магдебургии. – 686 с.
14. Акты Виленской археографической комиссии. – Вильно : Тип. А.Г. Сыркина, 1875. – Т. 8 : Акты Виленского гродского суда. – 765 с.


РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ

15. Паўлоўская, Г.Г. Гродзенскія кляштарныя хронікі як крыніца па гісторыі Гродна другой паловы XVII–XVIII ст. : дыс. …канд. гіст. навук : 07.00.09 / Г.Г. Паўлоўская. – Мінск, 2011. – 152 с.

16. Zaleski, S. Jesuici w Polsce.: w 5 t. / S. Zaleski. – Krakow : drukiem i nakladem drukarni W.L. Anczyca i SP, 1905. – Tom IV. Cz. I : Dzieje 153 kolegiow i domow jesuitow w Polsce. – 478 s.

17. Котлярчук, А.С. Праздничная культура в городах России и Белоруссии XVII в.: официальные церемонии и крестьянская обрядность / А.С. Котлярчук. – Спб : РАН, 2001. – 238 с.

18. Паўлоўская, Г. Апісанне гарадзенскіх соймікаў у хроніках бернардзінскага кляштара / Г. Паўлоўская // Гарадзенскі палімпсест. Дзяржаўныя ўстановы і палітычнае жыццё. XV–XX стст.: зб. навук. арт. / Гарадзенская бібліятэка; пад рэд. А.Ф. Смаленчука. – Гродна, 2009. – С. 220–238.

19. Трусов, И.Г. Некоторые источники, как зеркала социальных, культурных и национальных перемен в Гродно XVI–XVIII вв. / И.Г. Трусов // Наш радавод: материалы междунар. науч. конф. по региональной истории Восточной Европы / Гродзенскі дзярж. унів. – Гродна, 1991. – Кн. 3. Ч. 1. – С. 224–226.

20. Марзалюк, І.А. Этнічны і канфесійны свет беларускага горада, XVI–XVIII стст. / І.А. Марзалюк. – Магілёў : МДУ, 2007. – 162 с.

21. Гардзееў, Ю. Да праблемы этнаканфесійнай структуры старажытнага Гродна / Ю. Гардзееў // Культура Гродзенскага рэгіёну: праблемы развіцця ва ўмовах поліэтнічнага сумежжа: матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі, Гродна, лістапад 1999 г. / ГрДУ ; рэдкал. : А.М. Пяткевіч [і інш.]. – Гродна, 2003. – С. 8–20.

22. Volumina Legum. Tom IV. Prava, konstytucye i przivileie krolewstwa Polskiego, Wielkiego Xiestwa Litewskiego y wszystkich prowincyi nalezacych na walnych sejmiech koronnyh. Ab anne 1641 ad annum 1668. – Petersburg : nakladem i drukiem Jozafata Ohryzki, 1859. – 519 s.

23. Mironovich, A. Kosciół prawosławny w dziejach dawnej Rzeczypospolitej / A. Mironowich. – Białystok : Wyd-wo univ. w Białymstoku, 2001. – 352 s.

24. Археографический сборник документов, относящийся к истории Северо-Западной Руси. – Вильно : Тип. Губернского Правления, 1867. – Том 2. – 406 с.

25. Карев, Д.В. Иезуиты и культура народов Великого княжества Литовского (II-я пол. XVI–XVIII вв.) / Д.В. Карев // Наш радавод: материалы Междунар. науч. конф. по региональной истории Восточной Европы / Гродзенскі дзярж. унів. – Гродна, 1993. – Кн. 4., ч. 2. – С. 504–510.

Гродненский государственный
университет им. Я. Купалы

Поступила в редакцию 15.11.2015

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ